

*Жабінкаўскі ўзорны ансамбль народнага танца «Каруначкі».*

**ЖА́БІНКАЎСКІ ЎЗО́РНЫ АНСА́МБЛЬ НАРО́ДНАГА ТА́НЦА «КАРУ́НАЧКІ»**. Створаны ў 1983 у г. Жабінка пры гар. Доме культуры. У 1985 прысвоена званне «ўзорны аматарскі калектыў». Заснавальнік і кіраўнік І.Ф.Румко. У складзе ансамбля 32 чал. ва ўзросце ад 8 да 16 гадоў. Асн. мэты дзейнасці — захаванне і папулярызацыя традыц. нар. танцаў. У рэпертуары танцы нар. бел. «Лявоніха», «Драпак», «Расходуха», «Рэпка», рус. «Барыня», укр. «Гапак», «Запарожскія казакі», «Кросны», літоўскі «Полька Рыга» і інш. Калектыў — лаўрэат і дыпламант фестываляў: міжнар. творчасці інвалідаў «Мы разам» (г. Брэст, 2012), рэсп. нац. культур (2010), сучаснага танца і харэаграфіі «Рытмы восені» (абодва г. Гродна), абл. тура рэсп. фестывалю нац. культур «Суквецце культур» (г. Маларыта, абодва 2011), рэсп. конкурсаў: мастацтваў «Вікторыя» (2010), юных выканаўцаў «Новы рух» (2011, абодва Мінск) і інш.

*Т.У.Ткачук.*

**«ЖА́БКА»**, беларускі народны імправізаваны танец; танец-гульня. Зафіксаваны на Віцебшчыне ў канцы 19 ст. Мае прымеркаванасць да вяселля, Каляд (падчас абраду *«Жаніцьба Цярэшкі»*). Выконваецца мужчынамі (часам жанчынамі) сольна, парна, радзей гуртам. Сродкамі перайимальнай пластыкі выканаўцы імітуюць розныя дзеянні жабы, дэманструюць сваю фіз. падрыхтоўку, спрыт, імправізацыйныя здольнасці. Асн. пластычным матывам «Ж.» з'яўляюцца скокі танцораў у гарызантальнай паставе, г.зн. абапіраючыся аб падлогу рукамі і нагамі. Сярод рухаў: падскокі ўгору з адначасовым выкідваннем рук і ног убок, скокі адзін цераз аднаго, перaскокі з боку ў бок, з рук на ногі, «танец на руках», «кручэнні на пузе», «вобразныя прысядкі», «пераборы нагамі» — у розных тэмпах і рытмах, дынаміцы і пластычных інтанацыях. «Ж.» выконваецца пераважна пад інструм. найгрыш (у т.л. пад польку, «Рускага», зрэдку пад марш), пад прыпеўкі [Скача жабка па дарожке, / Скача, выцягнуўшы ножкі. / А як стану раг(к)ачом, / Выскачу туркачом], плясканне ў ладкі, рытмічнае выбіванне рознымі прадметамі, выгукванне. Асобныя харэагр. элементы «Ж.» сустракаюцца ў танцах «Мікіта» (Пружанскі р-н), «Казёл» (Маларыцкі р-н), «Лявоніха» (Мазырскі р-н) і інш. На сцэне «Ж.» ўпершыню пастаўлена В.Паповым у харэагр. ансамблі «Рунь» (1996, г. Магілёў).

*Літ.*: Чурко Ю.М. Белорусский хореографический фольклор. Минск, 1990.

*М.А.Козенка.*

**ЖАБРА́ЦКІЯ ПЕ́СНІ**, фальклорныя творы духоўна-рэлігійнага зместу, якія выконваліся жабракамі-спевакамі, калікамі перахожымі (спевакамі-вандроўнікамі), як правіла пад акампанемент ліры (зрэдку скрыпкі). У народзе гэтыя вандроўныя спевакі называліся «лірнікамі». Звычайна яны пакутавалі ад якіх-небудзь фіз. недахопаў (слепата, глухата і г.д.). Іх вадзілі па вёсках хлопчыкі-калекі, якія ў маленстве пераймалі Ж.п. ад дарослых спевакоў, а ў сталым узросце набывалі ўласную ліру і падарожнічалі па родных мясцінах, выконваючы духоўныя песні. Ж.п. можна ўмоўна падзяліць на некалькі груп. Да 1-й адносяцца песні, дзеючай асобай у якіх з'яўляецца Пятніца. У адпаведнасці з хрысціянскай версіяй, яна дапаўняе культ Параскевы Пятніцы ва ўсх. і Св. Петкі — у паўд.

славян. У духоўных песнях Пятніца сочыць, каб перад хрысціянскімі святамі выконваўся пятнічны пост, бо быццам бы сам Хрыстос будзе спавядаць душы людзей. Другая група Ж.п. — творы ў выкананні калікаў перахожых, жабракоў, 3-я — цыкл песень «Жабрацкі «Лазар», які быў папулярны ў Мінскай губ. Цэнтр. яго падзея — высвятленне ўзаемаадносін паміж багацеем і «Лазарам», якое перарастае ў драм. процістаянне хрысціянскай маралі і нажывы. Багацей на тым свеце звяртаецца да Лазара, каб той дапамог прасіць ва Усявышняга для сябе паратунку. Але Лазар раіць самому вырашаць, як «да Бога даступіцца». У Ж.п. праслаўляецца імя Хрыста, калікі выступаюць носьбітамі яго ідэй і спраў, нагадваюць людзям пра іх грахі, неабходнасць захоўваць маральную чысціню, каб уваскрэснуць з памерлых і апынуцца ў раі.

*Літ.*: Марозаў А.У. Беларускія духоўныя вершы: крыніцы вывучэння, геаграфічнае распаўсюджванне, асаблівасці выканання, сюжэтна-вобразная разнастайнасць // Міфалогія. Духоўныя вершы. Беларускі фальклор. Жанры, віды, паэтыка. Мінск, 2003. *А.М.Аляхновіч.*

**ЖАБРО́ЎСКІ** Тамаш (25.11.1714, каля г. Навагрудак — 18.3.1758), беларускі архітэктар, матэматык. Магістр філасофіі і вольных навук (1752). У 1735—38 вучыўся ў Віленскай езуіцкай акадэміі, у 1750—52 у Вене і Празе. Праф. у Ілукшце (Курляндыя, 1745—46), прэфект будаўніцтва ў Бабруйску (1746—48), праф. і прэфект бурсы ў Крожах (Літва, 1746—48). У 1748—50 міністр і прэфект будаўніцтва ў Вільні. Выкладаў у Віленскай езуіцкай акадэміі (1752—58) і Полацкім калегіуме. Як архітэктар распрацаваў планы шматлікіх храмаў і палацаў. Сярод асн. работ: касцёлы езуіцкі ў Бабруйску (1745—46), Св. Ігнацыя і калегіум (1748—50), абсерваторыя езуіцкага калегіума (1752—53), перабудова касцёла Св. Яна (1756—58, усе ў Вільні), інтэр'ер кальвінскага збору ў в. Жодзішкі Смаргонскага р-на (1757—66), праект касцёла бенедыкцінак у Крожах і інш. Кіраваў будаўніцтвам езуіцкага кляштара ў Полацку, праектаваў (каля 1750) палац Агінскага ў маёнтку Ганута (цяпер в. Ручыца) Вілейскага р-на.

**ЖА́БЧЫЦКАЯ ЦАРКВА́ ПАРАСКЕ́ВЫ ПЯ́ТНІЦЫ**, помнік народнага дойлідства ў в. Жабчыцы Пінскага р-на. Пабудавана ў 1788 з дрэва. Адноўлена ў 1863. Аб'ёмна-прасторавую кампазіцыю храма складаюць прамавугольныя зрубы бабінца і малітоўнай залы пад агульным дахам і 5-гранная апсіда з бакавымі рызніцай і ахвярнікам. Над цэнтрам 2-схільнага гонтавага даху ўзвышаецца 2-ярусны 8-гранны барабан, завершаны цыбулепадобным купалам. Двух'ярусны бабінец (2-і ярус — званіца) накрыты больш нізкім 2-схільным дахам, франтон якога рытмічна спалучаецца з франтонам асн. аб'ёму. Вертыкальна ашаляваныя сцены прарэзаны прамавугольнымі аконнымі праёмамі, упрыгожанымі простымі ліштвамі. Храм унесены ў Дзярж. спіс гісторыка-культ. каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь. Царква дзейнічае.

**ЖАК**, венцер, традыцыйная рыбалоўная снасць. Вядома па ўсёй Беларусі. Сеткавы мяшок (куль) на абручах з адной або дзвюма перагародкамі (горламі) унутры. Рыба заплывала ў куль праз адтуліну ў горле. Да мяшка пры ўваходзе прывязвалі адно (аднакрылы Ж.) ці 2 (двухкрылы Ж.) сеткавыя крылы, нацягнутыя па вертыкалі на драўляныя планкі. Яны перагароджвалі шлях рыбе і накіроўвалі яе ў куль. У глухім канцы куль сцягваўся шнурком. У вадаёме ўстанаўліваўся пры дапамозе калкоў.

**ЖАКО́ЎСКІ** Рамуальд (1897—1.12.1919), беларускі акцёр. У 1917—19 у трупе Першага т-ва бел. драмы і камедыі. У снеж. 1918 — сак. 1919 працаваў у Бел. сав. тэатры, у крас.—ліст. 1919 — у Вільні (з Ф.П.*Ждановічам*). Найб. вызначыўся ў характарных ролях: Пісар і Кукса («Пашыліся ў дурні» М.Крапіўніцкага), сват Якуб («Модны шляхцюк» К.Каганца), Старац («Раскіданае гняздо» Я.Купалы ) і інш. Выступаў у дывертысментах з дэкламацыяй вершаў, часам і сваіх.

**ЖАЛДАКО́Ў** Анатоль Уладзіміравіч (н. 18.5.1929, г. Уладзікаўказ, Паўн. Асеція, Расія), беларускі архітэктар. Засл. архітэктар Беларусі (1991). Скончыў Маскоўскі архіт. ін-т (1954). З 1970 у ін-це «Белдзіпрагандаль», з 1990 кіраўнік персанальнай творчай майстэрні, з 2000 у ін-це «НІПТІС» Мін-ва архітэктуры і будаўніцтва. Асн. работы: у Мінску — крыты рынак «Камароўскі» (1980, у суаўт.), універсамы «Рыга» (1980) і «Талін» (1982), будынак Мін-ва гандлю і Мін-ва спорту і турызму (1980), службова-гасп. корпус СМ Беларусі па вул. Мяснікова (1983); крыты рынак у Брэсце (1987). Працуе таксама ў графіцы.



*Жабчыцкая царква Параскевы Пятніцы.*